■ Спорт-тайм

# Скандалы завяршаюць чэмпіянат краіны па футболе

**У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра вынікі перадапошняга тура першынства Беларусі па футболе, гаворым пра поспехі айчынных плыўцоў і тэнісістаў на міжнародных спаборніцтвах і робім агляд выступленняў гандбольных клубаў у топ-турнірах.**

1. **Павел Санковіч перамог на дыстанцыі 50 м на спіне на заключным этапе Кубка свету, які прайшоў у Сінгапуры.** На сваёй каронной дыстанцыі спартсмен паказаў вынік 22,82 сек. Нагадаем, што падчас этапаў Кубка свету ў 2017 годзе на дыстанцыі 50 м на спіне Санковіч перамагаў у Маскве, Эйндхавене і Ганконгу.



Узнагароды ў скарбонку беларускай каманды ў Сінгапуры таксама прынеслі Яўген Цуркін, які на дыстанцыі 100 м батэрфляем заняў трэцяе месца — 50,22 сек., і Ілья Шымановіч, які падняўся на другую прыступку п'едэстала на дыстанцыі 50 м брасам.

Пераможцам агульнага заліку Кубка свету стаў паўднёваафрыканскі спартсмен Чад ле Кло.

2. **Арына Сабаленка і расіянка Вераніка Кудзерметава сталі пераможцамі парнага разраду на турніры ў Тайбэі з прызавым фондам $115 тыс.** У фінальным матчы



беларуска-расійскі тандэм перайграў аўстралійска-брытанскі дуэт Моніка Адамчак / Наомі Броўдзі — 2:6, 7:6 (7:5), 10:6.

3. **Беларускія гандбольныя клубы правялі чарговыя матчы розыгрышаў кантынентальных турніраў.** У першым паядынку 3-га кваліфікацыйнага раўнда Кубка ЕГФ віцэ-чэмпіёны краіны гандбалісты мінскага СКА прымалі на паркеце сталічнага палаца спорту «Уручча» іспанскі «Лагранья» і перамаглі 36:28. Гэта добры зачын перад сустрэчай у адказ за выхад у групавы этап Кубка ЕГФ, якая адбудзецца 25 лістапада ў Іспаніі.



Брэсцкі гандбольны клуб імя Мяшкова на выездзе ў матчы ў адказ саступіў нямецкаму «Фленсбургу» ў восьмым туры Лігі чэмпіёнаў 30:37. Зараз у групе з 14 ачкамі лідзіруе ПСЖ. БГК дзеліць 6-е месца з славенскім «Цэлье».

Гандбалісты «Гомеля» ў першым матчы кваліфікацыі Кубка выклiку прайгралі ў Жлобіне ісландскаму клубу «Вестманаэяр» — 27:31. Паўторная гульня адбудзецца 25 лістапада.

У 3-м крузе кваліфікацыі жаночага розыгрышу Кубка ЕГФ гандбалісткі «Гомеля» двойчы сустракаліся з нарвежскім «Бюасен». У першай гульні гамяльчанкі саступілі з лікам 28:32, а 18 лістапада ў Жлобіне таксама пацярпелі паражэнне — 22:27 — і не прайшлі ў групавы этап.

«БНТУ-БелАЗ» таксама завяршыў свой еўракубкавы сезон. У першым паядынку каманда Канстанціна Шавварава адолела на сваёй пляцоўцы дацкі «Рандэрс» з мінімальнай перавагай — 23:22, а ў матчы ў адказ на выездзе саступіла з розніцай у тры мячы — 23:26.

4. **Пасля матчаў перадапошняга, 29-га, тура футбольнага чэмпіянату краіны ў лідары выйшаў барысаўскі БАТЭ.** У матчы з гродзенскім «Нёманам» яны прапусцілі гол ужо на 13-й хвіліне (пенальці), а ў другой палове сустрэчы здолелі захапіць ініцыятыву. Спачатку Мікалай Сігневіч зраўняў лік, затым Віталь Радзівонаў у даволі спрэчнай сітуацыі (на думку часткі балельшчыкаў і спецыялістаў, футбаліст згуляў рукой) забіў другі гол, кропку паставіў Міхаіл Гардзяйчук — 3:1.

«Шахцёр» вельмі няўдала правёў паядынак супраць жодзінскага «Тарпеда-БелАЗ», саступіўшы з лікам 1:2. Спрэчны момант паўстаў і ў гэтай сустрэчы, магчыма, тарпедаўцы забілі адзін з мячоў са становішча «па-за гульнёй». Спрэчныя моманты ў гэтых матчах атрымалі шырокае скандальнае абмеркаванне ў коле балельшчыкаў.

Мінскія дынамаўцы адолелі «Крумкачоў» 1:0, брэсцкае «Дынама» не здолела перайграць «Гарадзею» — нічыя 1:1. Футбалісты «Віцебска» на выездзе ўзялі верх над «Слуцкам» — 3:2.

Унізе турнірнай табліцы працягваецца барацьба за захаванне прапіскі ў найвышэйшай лізе. Футбалісты «Іслачы» здолелі вырваць перамогу ў «Дняпра» — 1:0 — і забяспечылі сабе месца ў эліце. На перадапошняй пазіцыі засталася мазырская «Славія», якая саступіла наваполацкаму «Нафтану» — 1:2. Футбалісты «Мінска» прайгралі «Гомелю» — 0:2.

Становішча камандаў перад 30-м турам: БАТЭ — 67 ачкоў (розніца мячоў — 58—16), «Дынама» (Мінск) — 65 (42—14), «Шахцёр» — 65 (51—19), «Дынама» (Брэст) — 48 (46—26), «Тарпеда-БелАЗ» — 48 (41—27).

Матчы заключнага тура адбудуцца 26 лістапада.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.48 | 17.02 | 8.14 |
| Віцебск — | 8.43 | 16.46 | 8.03 |
| Магілёў — | 8.38 | 16.52 | 8.14 |
| Гомель — | 8.28 | 16.56 | 8.28 |
| Гродна — | 9.02 | 17.19 | 8.17 |
| Брэст — | 8.56 | 17.26 | 8.30 |

### Месяц

*Маладзік 18 лістапада. Месяц у сузор'і Казярога.*

### Імяніны

*Пр. Гаўрылы, Міхаіла, Рафаіла.*
*К. УВЯДЗЕННЕ БАГАРОДЗІЦЫ Ў ХРАМ. Марыі, Рэгіны, Альберта, Кандрата, Яна.*



Фота Надзеі НІКАЛАЕВАЙ.

## ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

### 21 ЛІСТАПАДА

*Сусветны дзень тэлебачання. Абвешчаны Генеральнай асамблеяй ААН 17 снежня 1996 года ў азнаменаванне першага Сусветнага тэлевізійнага форуму, які адбыўся ў штаб-кватэры ААН 21 лістапада 1996 года.*

**1812** год — адбылася Барысаўская бітва (21—23 лістапада), баі паміж расійскай 3-й Заходняй арміяй (галоўнакамандуючы П. В. Чычагаў) і французскімі войскамі за авалоданне г. Барысавам і мастом цераз р. Бярэзіну. Асноўная групоўка войскаў Напалеона адыходзіла ад Оршы праз Талачын, карпусы К. Віктора і Н. Ш. Удзіно — ад Чарэі (цяпер Чашніцкі раён) і Халопенічаў (цяпер Крупскі раён). Армія Чычагава рухалася з боку Мінска. Пасля ўзмацнення часцямі былога мінскага гарнізона колькасць французскага гарнізона ў Барысаве склала каля 5 тыс. чалавек. 21 лістапада расійскі авангард Ламберта (каля 4,5 тыс. чалавек) раптоўна атакаваў французскія ўмацаванні перад мостам, захапіў яго і да канца дня авалодаў Барысавам. 22 лістапада ў горад увайшла армія Чычагава, які, аднак, не прыняў належных мер па назіранні за сапернікам. Таму 23 лістапада не змог аказаць супраціўлення наступленню французаў і адступіў. Корпус Удзіно ўварваўся ў Барысаў. Горад быў разбураны і спалены. 25 лістапада ў Барысаў прыбыў Напалеон. Страты расійскіх войскаў склалі каля 3 тысяч, французскіх — каля 5 тысяч чалавек. Вынікам Барысаўскай бітвы былі часовы пераход аператыўнай ініцыятывы да Напалеона і пераправа яго арміі цераз Бярэзіну.



**1900** год — дата нараджэння Міхаіла Іванавіча Дзянісава, спевака, народнага артыста Беларусі (1944). У 1933—1958 гадах — саліст Дзяржаўнага тэатра оперы і балета Беларусі. Сярод партый: Кузьміч («У пушчах Палесся» А. Багатырова), Змітрок («Міхась Падгорны» Я. Цікоцкага), Мечнік («Страшны двор» С. Манюшкі) і інш. У канцэртным рэпертуары спевака значнае месца займалі беларускія народныя песні, творы беларускіх кампазітараў. У 1958—1964 гадах быў мастацкім кіраўніком Беларускай філармоніі, у 1964—1970 гадах — выкладчык Беларускай кансерваторыі. Памёр у 1971 годзе.

**1918** год — дэкрэтам СНК «Аб устанаўленні ва ўстановах паштова-тэлеграфнага ведамства продажу твораў савецкага друку» прадпісвалася з 1 снежня 1918 года ва ўсіх установах ведамства пачаць рознічны продаж газет, часопісаў і кніг. Дэкрэт адкрываў вялікія магчымасці па шырокім забеспячэнні насельніцтва краіны друкаванымі выданнямі.

**1918** год — нарадзіўся Міхаіл Андрэевіч Глузскі (1918—2001), выдатны савецкі акцёр тэатра і кіно, народны артыст СССР. Здымаўся ў фільмах «У агні броду няма», «Прыйшоў салдат з фронту», «Маналог», «Спыніўся цягнік» і многіх іншых.

Было сказана

**Ніна МАЦЯШ, паэтэса:**
*«О, боязь за другога чалавека!*
*Адна ты робіш чалавека з нас...»*

## УСМІХНЕМСЯ

— Доктар, у мяне дрэнная памяць. Што мне рабіць? З мяне ўсе смяюцца!
— Займіцеся боксам!
— Мая памяць стане лепшай?
— Не, але смяяцца будуць менш.

**А я скончыла ўніверсітэт і стала псіхіятрам...**

— Міша, а ты ў арміі служыў?
— Не, не служыў. Мяне не ўзялі.
— А чаму цябе не ўзялі?
— Знайсці не змаглі...

**Каб пазнаёміцца з мужчынам, наша суседка Анжэла не ідзе ў тэатр ці музей, яна проста ідзе ў супермаркет і падыходзіць да таго, хто доўга выбірае пельмені.**

— Сынок, ну калі ты ўжо ажэнішся? Колькі можна чакаць сваю Папялушку з белай мультываркай?!

**Пяць гадоў таму, калі я паступіла ў медыцынскі, усе сваякі радаваліся, што ў іх будзе свой доктар, які будзе іх лячыць.**




Малюнак Алега ГУЦОЛА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.
Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 4365.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
Нумар падпісаны ў 19.30 20 лістапада 2017 года.